# «ЁСЦЬ АДНА ПЕСНЯ ПЕСНЯЎ – ПРА РАДЗІМУ»: ПАЭТЫЧНЫ ВОБРАЗ «МАЛОЙ РАДЗІМЫ» Ў ТВОРАХ МАКСІМА ТАНКА

***А. А. Жэлуновіч,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры рускай мовы як замежнай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*
***В. Б. Несцяровіч,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры рускай мовы як замежнай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Я толькі частку невялічкую
Змог праспяваць
Таго, што расказалі мне
Вятры, дарогі,
Валуны і рэкі,
Лясы і зоры...
Максім Танк

Паэзія Максіма Танка ўражвае разнастайнасцю тэм, вобразаў, форм, творчым засваеннем нацыянальнай паэтычнай традыцыі. А галоўная тэма, якая праходзіць праз усю творчасць Максіма Танка, – Радзіма ў самых розных яе праявах: гісторыя і яе адлюстраванне ў легендах і паданнях, песні і казкі, маляўнічая прырода, родная зямля… *«Ёсць адна песня песняў – /Пра радзіму»* [6, с. 82], – пісаў Максім Танк, сцвярджаючы важную думку, што зямля, на якой нарадзіўся і вырас, – самая важная тэма для паэта, «песня песняў».

Зямля – вызначальная прыродная і духоўная канстанта нашага нацыянальнага быцця. У мастацкай свядомасці Максіма Танка родная зямля – гэта надзвычай важны вобраз-матыў, крыніца натхнення мастака слова.

Вобраз «малой радзімы» паэт пранёс праз усе жыццё. Нарачанскі край, веску Пількаўшчыну Максім Танк услаўляў у сваіх творах. Чыстыя і светлыя пачуцці паэта нараджалі і адпаведныя настрою радкі: *«Помні заўжды аб зямлі той, / Што нарадзіла цябе...»* [4, с. 523], *«Мне за ўсё даражэй /Небазвод нарачанскі, / Абапёрты на плечы /Вынослівых сосен…»* [4, с. 524].

Максім Танк шукаў «непаўторныя фарбы і гукі» прыроды паўсюдна – «сярод сузор’яў, дрэў і траў, там, дзе ніхто іх не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шукаў» і нарэшце знаходзіў іх у блізкім і родным нарачанскім краі, у наднёманскіх лясах, на пявучай беларускай зямлі, дзе *«крыніцы звіняць, пераліўчата ззяюць азёры, / Дзе стаяць веліканы – капцы-курганы, / Векавечным парослыя борам»* [3, с. 3]. Паэт пісаў, услаўляючы родную зямлю:

Ёсць такая зямля казак, песень, якіх
Больш нідзе не пачуць, не знайсці,
Дзе ў купальскую зачараваную ноч
Расцвітае цвет папараці.

Ёсць такая зямля: дзень адзін пражывеш,
І адступяць ліхія нягоды,
Будеш марыць аб ёй, будзе сніцца табе,
Будеш помніць яе ты заўсёды.

Вось на гэтай зямлі шчасце выпала мне
Жыць, за плугам хадзіць і збіраць
Непаўторныя казкі і песні яе,
Каб, сябры, усе іх вам перадаць [3, с. 3].

Паэт Анатоль Вярцінскі адзначыў: «Музу Максіма Танка цяжка ўявіць у адрыве ад нарачанскіх хваль і сосен, ад роднай прыроды» [2, с. 10]. Ужо ў першых творах для дзяцей, казках «Сказ пра Вяля» і «Казка пра Музыку», заснаваных на народных легендах, ёсць аўтарскія эпізоды, якія пераконваюць у незвычайнай, нават казачнай прыгажосці любімай паэтам зямлі, напоўненай непаўторнымі гукамі і фарбамі: калі слугі шукалі Музыку, ім падавалася, што ўсё «наваколле грае і спявае», а адкуль чуўся той дзіўны водгалас, здагадацца не маглі [3, с. 20]:

Адзін кажа:
– Можа, гэта здань?
Другі:
– Мо трава спявае?
Толькі трэці,
Прылажыўшы вуха,
Кажа:
– Братцы! Тут зямля такая!..

«Тут зямля такая!..» – за гэтымі словамі разуменне, наколькі спеўная, мілагучная, шчодрая на таленты беларуская зямля. У самыя светлыя хвіліны жыцця яна бачыцца і чуецца паэту *«Ціхім шэпатам крынічным / Шумам трыснікоў зялёных, / Медным коласам пшанічным, / Васільковым звонам лёну»* [3, с. 36]. Гэта эстэтычнае адкрыццё Максімам Танкам роднай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямлі як сімвала высокай красы і выключнай духоўнай каштоўнасці: «*Ёсць куток на зямлі: / Дзень адзін пражывеш – / Назаўсёды цябе зачаруе*» [3, с. 36], «*А глянеш навокал – / Такая краіна: / Дзе ступіш – то рэха, / То казка, быліна...*» [3, с. 17].

Максім Танк заўсёды знаходзіць нешта асаблівае, патаемнае ў звыклых малюнках прыроды. У яго «*чоўнам выплывае сіні дзень*», «*з трыснікамі гавораць азёры*», «*зачапіўшыся за сасновы грэбень, калышацца сіняе неба*» [3, с. 18], «*сонца ў хвалях мора тае*», «*ціхай скрыпкай*» грае вецер [3, с. 34], «*сонца спелаю ранетай наліваецца над Нёмнам*» [3, с. 36].

Пры зрокавым успрыняцці Максім Танк перш за ўсё выдзяляе колер ва ўсім багацці тонаў і паўтонаў. У яго вецер «*сівыя хвалі Нёмну пеніць*», «*золатам сінім зігцеюць азёры*», «*вясёлкай ззяюць воды сінія*» [3, с. 36], «*купаецца зялёны вецер у траве*» [3, с. 22], «*шумяць прасторы жыта ў залатым імглістым цвеце*» [3, с. 31].

Разважаючы пра паэзію Максіма Танка, літаратуразнаўца А.І. Бельскі адзначыў: «Паэзія Максіма Танка – уся ад зямлі…» [5, с. 14]. Яна зраслася з роднай зямлёй, стала яе непаўторным адлюстраваннем у адметных мастацкіх вобразах, выяўленнем глыбіннай існасці маці-зямлі – жыццядайнай і шчодрай, цярплівай і трывалай, адухоўленай і песеннай» [1, с. 22].

Родная зямля, «малая радзіма» ў Максіма Танка паняцце персаніфікаванае, асабовае… «*Я разгадаць не раз хацеў / Твой дзіўны вобраз…*» [4, с. 83], «*І толькі ўсюды тваё імя / Мне шэпчуць травы і лісты…*» [4, с. 84].

Лес, поле, возера Нарач, нарачанскія сосны, Нёман ствараюць разам нацыянальны пейзаж роднай зямлі, бясконца прыгожай, мілай сэрцу: «*Я, нават будучы глухім, / Між тысяч іншых сосен / Адрозніў бы іх пошум*» (верш «Наднарачанскія сосны»), «*Люблю твае, Нарач, затокі і тоні, / Як вецер густыя туманы развесіць, / Ці пена срабрыста на хвалях зазвоніць, / Цалуючы зоры, калышучы месяц*» (паэма «Нарач»).

Адзін з даследчыкаў творчасці паэта Мікола Арочка прызнаваўся: «Максім Танк – тая паэтычная планета, у стасунку да якой міжвольна адчуваеш сябе «спадарожнікам...» [5, с. 23]. Так, яркасць і прыцягальнасць паэтычнай планеты Максіма Танка абумовілі тыя духоўныя крытэрыі, якімі ён кіраваўся ў жыцці і творчасці. А яшчэ яна падмацаваная вялікай любоўю да нарачанскага краю, «малой радзімы» – Пількаўшчыны, што на Мядзельшчыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У паэта гэтае паняцце культавае, якое вырастае да духоўна-філасофскага канцэпту (вершы «Гэта зямля – нічым не прыкметная», «Заўсёды можна знайсці…»). Своеасаблівым жа кодам да творчасці Максіма Танка можа служыць яго верш «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма…»: *«Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма, / І калі мо не на ўсе песні хопіць / Адмеранага лёсам часу, ведай: / Я дапяю іх, нават калі буду / Пясчынкай на тваіх шляхах бясконцых, / Сасной на нарачанскім узбярэжжы / Ці жаўруком – прадвеснікам жыцця»* [4, с. 524].


*1. Бельскі, А. І.* Максім Танк: паэтычная філасофія зямлі / А. І. Бельскі // Сёмыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. – Мінск : БДПУ, 2010. – 292 с.

*2. Вярцінскі, А.* І становіцца песняй… / А. Вярцінскі // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 17 верасня. – С. 10.

*3. Танк, М.* Блікі сонца / М. Танк. – Мінск : Юнацтва, 1997. – 127 с.

*4. Танк, М.* Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск : Маст. літаратура, 1980. – Т. 4. – 720 с.

*5. Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – Т. 1. – 374 с.

*6. Танк, М.* Мой каўчэг : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літаратура, 1996. – 207 с.


## БЕЛОРУССКОЕ МУЗЫКАЛЬНОЕ ИСКУССТВО – СВЯЗЬ ПОКОЛЕНИЙ СКВОЗЬ СТОЛЕТИЯ


***С. Д. Казюлина,***

*соискатель ученой степени кандидата искусствоведения Белорусского государственного университета культуры и искусств*


С каждым годом все сильнее ощущается потребность обращения к духовному наследию белорусов, тем богатствам культуры и искусства, в которых запечатлена душа и историческая память народа, создавшего истинные шедевры, свидетельствующие о таланте и художественном вкусе наших предшественников. Изучение и популяризация духовного наследия, уважение к своей истории и традициям, любовь к Отечеству и малой родине – важнейшие составляющие нравственного и патриотического воспитания молодого поколения [1].

Обращаясь к наследию белорусского народа, мы, прежде всего, говорим о выдающихся людях, которые создавали духовное богатство нашей белорусской земли. Золотой фонд на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ